ЧАС ПРАЎДЗІВЫХ НАВІН
№33 (556)
15 ЖНІЎНЯ 2013, ЧАЦВЕР

ганцавіцкі час

ВЫДАВЕЦ: ПВГУП «МЕДЫЯ-ГАНЦАВІЧЫ» | ПЕРЫЯДЫЧНАСЦЬ: 1 РАЗ У ТЫДЗЕНЬ
WWW.GANC-CHAS.BY

У НУМАРЫ

Мошчы святой Тэрэзы на зямлі Ганцавіцкай



ДУХОЎНАСЦЬ

Усяго каля пяці гадзін былі на ганцавіцкай зямлі 13 жніўня мошчы святой Тэрэзы. У касцёле Адведзінаў Найсвяцейшай Панны Марыі да іх маглі прыкласціся і католікі, і праваслаўныя з просьбамі прабачыць грахі і слабасці, дапамагчы вырашыць праблемы.

У Ганцавіцкім касцёле ў гэты дзень панавала асаблівая атмасфера: нячаста перад алтаром з'яўляюцца такія святыні – яскравыя вобразы набожнасці вернікаў. У гонар рэліквіі прайшла святочная імша, якую праводзілі айцец Аркадзій Куляха (выкладчык Пінскай духоўнай семінарыі) і айцец Алег Шпець – настаяцель касцёла Адведзінаў Найсвяцейшай Панны Марыі. *"Святая Тэрэза ад Дзіцяткі Езуса адкрыла ў сваім жыцці Бога. Яна зразумела, што на любоў можна адказаць толькі любоўю"*, – гучалі пад зводамі храма.

→ Працяг на 3-й стар.

Дакранаючыся рукамі да каўпака, пад якім захоўваюцца мошчы Святой Тэрэзы, прыхаджане прасілі Божай міласці, заступніцтва і дапамогі ў сваіх жыццёвых клопатах.

ФОТА СВЯТЛАНЫ ЛОКТЫШ

ПРОИСШЕСТВИЯ

В водоеме утонула пенсионерка

В пятницу, 9 августа, в 12 часов 17 минут, в милицию поступило сообщение фельдшера бригады скорой медицинской помощи УЗ «Ганцевичская ЦРБ» о том, что в д. Ганцевичи в водоёме утонула пожилая женщина.

Водоем, где оборвалась жизнь 82-летней женщины, расположен вблизи дома № 13«А» по ул. Пинской. Погибшая жила рядом. Как пояснил начальник районного отдела следственного комитета (РОСК) Андрей Денисеня, по предварительным данным, сельчанка пошла на водоем полоскать мешки от картошки, во время работы ей стало плохо, она упала в воду и задохнулась.

На данный момент следственный комитет проводит проверку по факту трагической смерти сельчанки, выясняя все обстоятельства ее гибели.

Урожай богат, да потерян

Как только в садах и огородах жителей Ганцевщины стал поспевать урожай, в милицию стали поступать звонки о его хищениях неизвестными лицами.

В прошлый понедельник, 5 августа, в 15 часов 12 минут поступило сообщение жителя города Евгения Занько, который проживает по ул. Калиновского, о том, что какой-то хулиган обтряс во дворе дома сливы и груши.

На следующий день, 6 августа, в 19 часов 28 минут поступило сообщение ганцевчанки Елены Дудко о том, что неизвестный злоумышленник на принадлежащем ей земельном участке, расположенном по ул. Железнодорожной, выкопал весь картофель, а также вырвал саженцы перца и помидоров.

Расхищается добро и в хозяйствах района. Так, в среду, 7 августа, в 22 часа 30 минут поступило сообщение сторожа МТФ СПК «Будча» В. Савени о том, что им задержаны граждане, похитившие с территории СПК мешок зерна.

По всем фактам хищений урожая проверку проводит РОВД.

В чем провинился... автомобиль?

Есть женщины в наших селеньях, способные ударом ноги повредить автомобиль! И мужчины найдутся, которые на машину идут с камнем...

О том, что ганцевчанка Инна М. ударом ноги повредила автомобиль «Мазда-323F», принадлежащий жителю г. Барановичи Антону С., сообщение поступило от владельца машины 6 августа в 22 часа 09 минут. Причины таких действий предстоит выяснить сотрудникам милиции.

В субботу, 10 августа, еще один автовладелец, на этот раз житель нашего города Дмитрий К., пожаловался на то, что в принадлежащей ему автомашине «Фольксваген-Гольф», стоящей около магазина «Валерия», ганцевчанин Виталий З. камнем разбил заднее стекло. РОВД проводит проверку.

Самогонщики не перевелись...

Не перевелись еще умельцы, изготавливающие самогон. Вот и приходится милиции активно бороться с самогонщиками, то и дело привлекая их к ответственности за «подпольное» изготовление самопального алкоголя.

В среду, 7 августа, в 14 часов 15 минут поступило сообщение ОБЭП о том, что по ул. Полесской в д. Задубье местная жительница Нина П. изготавливает и реализует самогон.

Спустя два дня, 9 августа, в 16 часов 15 минут поступило сообщение из уголовного розыска Ганцевичского РОВД о том, что ранее привлекавшиеся к административной ответственности по ст. 12.43 КоАП РБ (изготовление и реализация самогона) жители деревень Хотыничи и Раздяловичи продолжают заниматься изготовлением самогона. Проверку по данным фактам проводит РОВД.

■ СВЕТЛАНА МАЛЫШКО

“Свіное” пытанне ў Палоні пад кантролем!

НЕАРДЫНАРНАЯ СІТУАЦЫЯ

Два выпадкі захворвання свіней у Палоні ў мінулую суботу, 10 жніўня, выклікалі хваляванні жыхароў раёна: ці не афрыканская чума прыйшла да нас? Галоўны ветурач раёна Ганна Рычаева запэўніла: сітуацыя пад кантролем!

Нездарма кажуць: у страха вочы вялікія. Вось і разнастайная інфармацыя пра афрыканскую чуму настолькі насцярожыла людзей, што звычайная вірусная хвароба свіней у Палоні выклікала шмат чутак, згадак і меркаванняў. Самыя страшныя з іх былі пра тое, што гэта афрыканская чума дасягнула межаў раёна.

Тыя, хто заходзіў у рэдакцыю, іншы раз расказвалі сапраўдныя страшылкі пра тое, што адбывалася ў Палоні.

І тэлефанавалі з розных вёсак. Апошні званок паступіў з самай далёкай вёскі раёна – Чудзіна. Іван Пятровіч Дайлід расказаў сваю версію таго, што адбывалася ў Палоні, і паставіў пытанне рубам: *“Дык адкажыце, чаго чакаць вяскоўцам?”*.

Журналіст звязалася па тэлефоне з галоўным ветурачом раёна Ганнай Рычаевай. Яна пацвердзіла, што ў Палоні сапраўды было два выпадкі падзяжу свіней, аднак заспакоіла: *“У жывёлін было вірусное захворванне, якое характарызавалася высокай тэмпературай. Іх прыйшлося дабіць і ўтылізаваць. Але гэта - не афрыканская чума”*.

Тым не менш, заўважыла Ганна Пятроўна, вірусныя захворванні небяспечныя тым, што іх могуць разносіць іншыя жывёлы, птушкі і нават людзі. *“Калі мы не можам адсачыць дзеянні птушак, дык сабаку на прывязі можа і павінен трымаць любы гаспадар. Менавіта сабакі часцей з’яўляюцца галоўнымі распаўсюджвальнікамі заразы”*, – адзначыла ветурач. Яна параіла таксама трымаць свіней у закрытых памяшканнях і быць асцярожнымі самім гаспадарам. *“Па кукурузе ходзяць дзікія кабаны, магчыма, некаторыя з іх – хворыя. А потым людзі туды ж ідуць, за нагамі могуць прынесці хваробу ў сваю гаспадарку”*, – прывяла прыклад Ганна Пятроўна.

Галоўны ветурач дадала таксама, што спецыялісты раённай ветэрынарнай станцыі пасля здарэння ў Палоні бываюць там штодня, назіраюць за жывёлай, прымаюць прафілактычныя меры. Так, яны праводзяць перадзабойны агляд свіней, іх перыяметрыю (вымярэнне тэмпературы). Ганна Пятроўна параіла: *“Дарэчы, любы гаспадар перад забоем жывёлы на яе агляд няхай выклікае ветурача. І пасля забою менавіта спецыяліст можа вызначыць, ці здаровае мяса. Гэта важна рабіць для ўласнага ж спакою”*.

■ СВЯТЛАНА ЛОКТЫШ

За неделю шесть пьяных водителей стали пешеходами

«ГЕРОИ ДОРОГ»

«Урожайной» выдалась прошедшая неделя для инспекторов ДПС, которые задержали шестерых водителей, рискнувших сесть нетрезвыми за руль транспортного средства. Им грозит наказание в виде штрафа и лишения прав сроком на три года.

В воскресенье, 4 августа, за управление транспортными средствами в состоянии алкогольного опьянения задержаны сразу трое водителей. Житель д. Русино, 52-летний Михаил Бегунов, управлял личной автомашиной «Фольксваген». Ганцевчанин Вадим Ханиев, 27-летний безработный, сел за руль личной автомашины «Фольксваген-Транспортер». И житель д. Локтыши, 23-летний мастер ОАО рыбхоз «Локтыши» Владимир Василенко, управлял личной автомашиной «Опель-Астра».

Спустя два дня инспекторы задержали еще одного нетрезвого водителя. Житель города, 43-летний инженер по качеству ДВК «Форест» Андрей Ивашко управлял личной автомашиной «ВАЗ-2106».

На следующий день, 7 августа, за управление транспортным средством в состоянии алкогольного опьянения был задержан Сергей Сайко, 43-летний житель д. Денисковичи, который работает трактористом ОАО «Райагросервис». Он управлял трактором МТЗ.

И 11 августа был задержан 35-летний Сергей Матусевич, безработный житель д. Локтыши, который в нетрезвом состоянии на личном скутере «Хонда» ездил по территории ОАО рыбхоза «Локтыши».

■ СВЕТЛАНА МАЛЫШКО

Нарушил запрет суда – попал под «уголовную» статью

КРИМИНАЛ

В прошлую среду, 7 августа, Ганцевичский РОСК возбудил уголовное дело по ст. 417 УК РБ (неисполнение приговора суда о лишении права заниматься определенной деятельностью) в отношении 51-летнего жителя д. Хотыничи.

Около двух лет назад, 25 ноября 2011 года, Юрий Ш. был ознакомлен с порядком и условиями отбывания наказания в виде лишения права заниматься деятельностью, связанной с управлением транспортными средствами, и предупрежден об уголовной ответственности за уклонение от отбывания наказания. Но должных выводов он не сделал: 19 апреля 2014 года в 11.20 сел за руль автомобиля марки «Форд» и отправился на нем по улице Раздяловичской в д. Хотыничи.

Нарушителю грозит наказание в виде штрафа либо ареста на срок до шести месяцев.

■ СВЕТЛАНА МАЛЫШКО

У ганцевчанина украли мотоцикл “Минский”

ЧЕЛОВЕК И ЗАКОН

В воскресенье, 11 августа, о краже мотоцикла из гаража родительского дома в г. Ганцевичи заявил в милицию 60-летний житель города, работающий мастером ГЛХУ «Ганцевичский лесхоз».

Ганцевчанин пояснил, что транспортное средство пропало в период времени с 5 по 11 августа. Неизвестный, сорвав навесной замок, из гаража во дворе дома по ул. Чехова похитил мотоцикл «ММВЗ-311211», причинив владельцу ущерб на 2 миллиона рублей. По факту кражи сотрудниками РОВД проводится проверка, по результатам которой через 10 дней будет принято решение о возбуждении уголовного дела.

■ СВЕТЛАНА МАЛЫШКО

Велосипед не дождался владельца

КРАЖИ

Может, и надеялся житель д. М.Круговичи Николай Л., что велосипед дождется его там, где он его оставил, но чуда не произошло.

Огорченный владелец сообщил в милицию о потере «железного коня» 8 августа в 12 часов 05 минут. Он пояснил, что 5 августа в 17.30 возле магазина в д. М. Круговичи он забыл свой дорожный велосипед, при этом на следующий день, 6 августа, придя утром к магазину, его там не обнаружил. Кто взял чужое добро, предстоит разобраться правоохранителям.

■ СВЕТЛАНА МАЛЫШКО

Мошчы святой Тэрэзы на зямлі Ганцавіцкай

ДУХОЎНАСЦЬ

→ Працяг. Пачатак на 1-й стар.

Напрыканцы імшы былі аб'яўлены інтэнцыі (замысел, імкненне да чаго-небудзь – С. Л.) біскупа Антонія Дзям'янкі: маліцца за сем'і і па магчымасці жадаць шматдзетных сем'яў, за пакліканне да святарства і за пабудову новых касцёлаў у Беларусі. *"Праяваю любові да Бога, да бліжніх і да самога сябе з'яўляецца малітва. Тэрэза ад Дзіцяткі Езуса ўсё сваё жыццё ператварыла ў малітву, разумеючы яе як узнёслае імкненне сэрца, позірк, скіраваны да Неба, плач падзякі і любові як у смутку, так і ў радасці. На пытанне, як трэба маліцца, святая давала адказ: "Як дзіця, якое яшчэ не навучылася чытаць; я проста кажу Богу ўсё, чаго жадаю, а Ён усё разумее"*, – сказаў падчас Літургіі слова айцец Аркадзій, які пасля імшы прапанаваў прысутным дакрануцца да мошчаў святой Тэрэзы і папрасіць яе заступніцтва перад Богам, а таксама прабачэння слабасцей і грахоў.



У час святой імшы ў ганцавіцкім касцёле. На пярэднім плане – мошчы святой Тэрэзы
ФОТА АЎТАРА

Як расказаў айцец Аркадзій, ініцыятыва перэгрынацыі (дальняга падарожжа) мошчаў святой Тэрэзы належыць каталіцкім біскупам. І нездарма гэта адбываецца сёлета – з кастрычніка 2012-га па кастрычнік 2013-га каталікі адзначаюць Год веры.

Перэгрынацыя мошчаў святой Тэрэзы па Беларусі пачалася 1 чэрвеня з Архікатэдры ў Мінску. Прадстаўнікі ордэна Босых Кармелітаў, якія суправаджаюць ў пілігрымцы рэліквіі, разам з ёй пабывалі ўжо ў многіх гарадах Мінскай, Магілёўскай, Гродзенскай і Брэсцкай абласцей, а з 14 жніўня адправіліся ў вандроўку па Гомельскай.

Перэгрынацыя скончыцца 27 жніўня на Віцебшчыне, пасля чаго мошчы святой адправяцца ў французскі горад Лізьё, дзе і захоўваюцца.

Увогуле, Беларусь – 76-я краіна свету на шляху перэгрынацыі мошчаў святой Тэрэзы. Магчыма, пасля гэтай пілігрымкі, у адпаведнасці са сваім абяцаннем, святая спашле на нашу шматпакутную зямлю "дождж ружаў", які з'яўляецца сімвалам Божай ласкі.

■ СВЯТЛАНА ЛОКТЫШ

Грошы ўзялі, а работу пакуль не зрабілі

ВАШ ЗВАРОТ

У рэдакцыю газеты «ГЧ» звярнулася Ала Глеб. Яна расказала: "Я інвалід 2-й групы. Два тыдні таму я звярнулася ў наш камунгас за паслугай па скошванні пустазелля. Пасля размовы з Аляксеем Галяком мне згадзіліся аказаць гэтую паслугу танней.

Праз нейкі час прыйшоў рабочы і сказаў мне, што не будзе працаваць, таму што яму дрэнна. Каб яму палегчала, прыйшлося даць бутэльку водкі. "Падлячыўшыся", работнік камунгаса скасіў толькі палову, бо пачаўся дождж, і ён пайшоў. Прыйшоў на другі дзень, крыху папэцкаўся – і зноў наўцёкі.

Заплаціла я за гэту паслугу 99 600 рублёў у камунгасе, ды яшчэ 50 тысяч аддала за бутэльку, якая пайшла на "лячэнне" касцу. А агарод мой да гэтага часу так і не скошаны. Каб я гэту справу ведала, то папрасіла б чалавека з Любашава, за 150 тысяч мне зрабілі б работу за дзень...", – скардзілася Ала Аляксандраўна.

Па словах жанчыны, яна звярталася ў камунгас. Яе адтуль адправілі словамі: *"Колькі заплацілі, столькі і скасілі!"*



Час ідзе, пустазелле буяе... Хочацца верыць, што хутка трава будзе скошана.
ФОТА АЎТАРА

Аднак да каго ў камунгасе звярталася, Ала Аляксандраўна сказаць не змагла. Дадала толькі, што з Аляксеем Галяком больш пагаварыць у яе не атрымалася, бо ён знаходзіцца ў адпачынку.

Карэспандэнт звязалася з намеснікам дырэктара КУШВП ЖКГ «Ганцавіцкая РЖКГ» Сяргеем Вайцешыкам. Той адказаў, што пасля адпачынку ён працуе ўжо паўтара тыдня. Пра гэты факт ён чуе ўпершыню, за гэты час да яго ніхто не звяртаўся з падобнымі просьбамі. *«Калі б Ала Аляксандраўна пайшла не ў рэдакцыю са скаргамі, а звярнулася да нас, то пытанне ўжо даўно вырашылася б,»* – сказаў Сяргей Канстанцінавіч і запэўніў, што ў бліжэйшы час пустазелле на ўчастку Алы Глеб будзе скошана.

■ ЮЛІЯ ПАЛЕСКАЯ

ГАНЦЕВЧАНЕ ОТВЕЧАЮТ

Как вы считаете, почему многие молодые специалисты после обязательной отработки не остаются работать в Ганцевичском районе?



Андрей Бусько, студент БГУ г. Минска:

– Молодых специалистов здесь не ценят. У нас негативное отношение к молодым кадрам сказывается во многом – работодатели не хотят брать на работу без опыта, открыто высказывают недоверие к профессионализму, да и зарплаты предлагают самые низкие.



Геннадий Карпович, житель города, пенсионер:

– Уверен, что молодежи не хватает социально-бытовых условий: жилья, культурных мероприятий и развлечений, условий для отдыха. Низкими зарплатами, как у нас в районе, также не привлечешь молодые кадры.



Ксения Майсюк, студентка БГЭУ:

– В Ганцевичах не хватает культурных мероприятий, мест отдыха, где молодежи можно было бы провести досуг. Еще, мне кажется, молодым специалистам мало платят, зарплаты у нас ниже, чем в Минске или Бресте, поэтому молодежь уезжает работать в эти города.



Наталья Бусько, студентка Гродненского университета Я. Купалы:

– В нашем городе не хватает хорошего отношения к молодым специалистам, как со стороны работодателей, так и людей. Молодежь считают неопытной, обижают. Жилье тоже имеет большое значение, у нас в городе получить квартиру перспектив мало.



Николай Рахнянский, житель города, газоэлектросварщик:

– Зарплаты у нас очень маленькие, а молодые специалисты без опыта работы и вовсе гроши получают. В больших городах зарплаты намного выше, молодежь правильно и делает, что уезжает туда.



Дарья Тихон, жительница д. Мальковичи, в отпуске по уходу за ребёнком:

– Нет нормального жилья и условий для жизни. Жить в общежитии, малосемейке или съемной квартире не все хотят. И еще у нас скучно. Местные жители привыкли, а тем, кто пожил в большом городе, у нас не интересно.



Юлия Кулешова, жительница г. Минска, в отпуске по уходу за ребёнком:

– Думаю, тот, кто пять лет учился и жил в Минске, не захочет менять комфортные условия на жизнь в глубинке. И многое зависит от оплаты труда. В столице больше перспектив найти высокооплачиваемую работу даже молодому специалисту.

■ ОПРОС ПРОВЕЛА СВЕТЛАНА МАЛЫШКО

Про активность клещей и нерасторопность врачей

РАКУРС

Сразу оговорюсь: речь пойдет о некоторых врачах санитарной службы района, к которым журналист обратилась за информацией об очередном пике активности клещей.

КОГДА СВИРЕПСТВУЮТ КЛЕЩИ...

О том, что клещи проявляют сильную активность, узнала из интернета. Теплая и влажная погода нынешнего лета, по словам специалистов, создает весьма благоприятные условия для развития этих насекомых. В эпицентре их активности оказались Брестская, Минская и Гомельская области.

Помощник врача-эпидемиолога ГУ «Районный центр гигиены и эпидемиологии» Александр Зуйкевич добавил также, что сейчас – конец лета, а это значит, пришла вторая волна активности небезопасных насекомых, которая продлится около 2-х месяцев. Однако, по словам Александра Николаевича, в этом году ситуация с укусами клещей в районе спокойнее: за помощью обратились 22 человека, из которых – двое детей. В прошлом году было 41 обращение, среди них 11 касались детей.

Но, возможно, эти цифры далеки от реальности: знаю немало знакомых, которые справились с укусами кровососов самостоятельно. Правда, этого врачи делать не рекомендуют: клещи являются разносчиками многих болезней, среди которых самые опасные – болезнь Лайма, энцефалит, менингит, поражение лицевых нервов и суставов. Врач, который удалит клеща, сдаст его на экспертизу в лабораторию и при необходимости назначит лечение.

Лучше всего, конечно, вообще избегать неприятного «знакомства» с насекомыми. Обезопасить себя, когда направляемся в лес, на пастбище или сенокос, Александр Николаевич советует следующим образом: одевать светлую одежду, на которой клещи хорошо заметны, причем рубашка или свитер должны быть с длинным рукавом, манжеты и воротник – плотно прилегать к телу. Брюки лучше заправить в носки, на голову одевать косынку или шапку. Придя домой, нужно обязательно осмотреть себя.

Важно знать, что клещей всегда больше около тропинок, где им проще выбрать жертву. На солнечных полянах клещей всегда меньше, чем в тени.

ЗА СЕМЬЮ ЗВОНКАМИ

Казалось бы, вовремя предупредить людей об опасности укусов клещами, в первую очередь, заинтересована именно санитарно-эпидемиологическая служба района. Однако получить ответы на вопросы мне удалось только с седьмого (!) раза. Не поленюсь описать свой «клещово-бюрократический» путь к совершенно незасекреченной, открытой для всех информации.

Сначала узнала имя специалиста, который может дать необходимую информацию. Специалист эпидотдела О. В. Винник сказала, что *«возьмет необходимые документы»*, но в это время А. Зуйкевич заявил, что без указания главного санитарного врача информацию мне не дадут. Как сообщила секретарь, А. Д. Соляник *«только что уехал в райисполком»*. На мобильный звонок Александр Данилович ответил сразу, не отказал журналисту в просьбе и предложил позвонить Л. И. Ковш. Очередной звонок в эпидотдел снова разочаровал: Лидия Ивановна оказалась в отпуске, да и *«не поступало никому от главврача указание дать информацию»*. Пришлось мне к концу рабочего дня в шестой раз набирать номер санэпидемстанции, чтобы связаться с А. Д. Соляником.

Правда, утром следующего дня в редакцию позвонил А. Н. Зуйкевич и предоставил всю необходимую информацию. Но до сих пор меня терзают сомнения: насколько оправдана такая перестраховка работников санэпидемстанции? Какие такие документы, на которые ссылался Александр Данилович и которые предписывают любую информацию давать только с разрешения главного санитарного врача, могут оправдать подобную нерасторопность работников санслужбы района?

Сегодня телефоны есть не только в каждом кабинете, но и у каждого из нас в кармане. Вот и предлагаю работникам санэпидемстанции среди огромной занятости все же найти время на организацию более быстрого сообщения со своими коллегами. Тогда главный санитарный врач не будет узнавать последним, что его сотрудник ушел в отпуск, а необходимая жителям района информация не будет «прятаться» за семью звонками журналиста.

■ СВЕТЛАНА ЛОКТЫШ

“Парыў” на Кастрычніцкай адрамантавалі, а на 17-га верасня – пакінулі

“ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ”

Аператыўна адрэагавалі майстры КУШВП ЖКГ “Ганцавіцкая РЖКГ” на зварот ганцаўчаніна аб парыве водаправода на галоўнай вуліцы горада. Яшчэ адзін парыў, які чакае ўвагі камунгасаўцаў, – на вуліцы 17 верасня.



Як толькі майстры камунгаса даведаліся аб парыве водапровода па вуліцы Кастрычніцкай, яны адразу яго адрамантавалі. ФОТА АЎТАРА

На водны ручай на вул.Кастрычніцкай некалькі тыдняў ніхто не звяртаў увагу. У суботу каля чатырох гадзін вечара дыспетчары ЖКГ прынялі заяўку аднаго з работнікаў ПМК-14, і праз некалькі хвілін майстры аварыйнай службы перакрылі ваду на гэтым участку. А ў панядзелак у абед водапровод ужо быў адрамантаваны.

Супрацоўнікі “ГЧ” даведаліся аб парыве водапровода з тэлефоннага званка на “гарачую лінію” газеты ад мужчыны, які не назваўся. Ён паведаміў, што амаль месяц з-пад каналізацыйнага калодзежа ў садзе насупраць ПМС б’е ручай. *“Там ужо балота стаіць, гэта ж колькі вады выцекла!”* – абураўся ганцаўчанін.

Майстар участка ВіК жыллёва-камунальнай гаспадаркі Леанід Кісялевіч сказаў, што сістэма трубаправода старая, таму і працякла. Работнікі ЖКГ замянілі каля метра трубы, і працёк быў ліквідаваны.

На пытанне, чаму каля месяца ніхто не “варушыўся” з рамонтам, Леанід Трафімавіч адказаў, што наўрад ці водапровод быў парваным так доўга. *“Каб месяц цякло, мы тут і ў гумовых ботах не прайшлі б. А так бачыце – суха, вада хутка сышла,* – сказаў ён. – *Чаму людзі не патэлефанавалі раней, бачылі ж, што цячэ?! Прывыклі скардзіцца ды абвінавачваць камунгаснікаў. Гэты ўчастак водапровода знаходзіцца ў баку ад жылля, і мы таксама не можам усё ўпільнаваць”.*

Нібы ў адказ на словы майстра камунгаса, у аўторак на гарачую лінію “ГЧ” патэлефанавала ганцаўчанка Ніна Вашкевіч, якая расказала аб парыве водапровода на завулку, які вядзе ад будынка гандлёвага цэнтра ў бок чыгункі (завулак 17 Верасня). *“Званілі ў ЖКГ, але пакуль што іх работнікі на званок не адрэагавалі. Вось ужо беражом ваду дык беражом!”* – абуралася безгаспадарчасцю жанчына. Супрацоўнікі “ГЧ” спадзяюцца, што і на гэты раз работнікі ЖКГ знойдуць і ліквідуюць парыў хутка і зладжана. А то неяк не стасуецца: Год эканоміі і беражлівасці – а горад губляе тоны вады. Сапраўды, не пагаспадарску...

■ СВЯТЛАНА МАЛЫШКА

Павялічылі колькасць падпісчыкаў – атрымалі прэміі



Пераможцы конкурсу – работнікі Кукаўскага аддзялення паштовай сувязі Ірына Міхайлаўна Лазовік, начальнік паштовага аддзялення (злева), і паштальён Вера Леанідаўна Скрыпко. ФОТА ПЯТРА ГУЗАЕЎСКАГА

КОНКУРСЫ

Газетай ”Ганцавіцкі час” быў аб’яўлены конкурс паміж аддзяленнямі паштовай сувязі раёна па падпісцы на”ГЧ” на 2-е паўгоддзе 2013 года. Конкурс праходзіў з 3-га мая па 30-га чэрвеня, і па яго выніках вызначаны пераможцы.

Найбольш плённа справіліся з задачамі конкурсу работнікі Кукаўскага аддзялення паштовай сувязі (начальнік – Ірына Міхайлаўна Лазовік, паштальён – Вера Леанідаўна Скрыпко), якія павялічылі колькасць падпісчыкаў на 34 чалавекі ў параўнанні са станам падпіскі на 1 красавіка і былі ўдастоены 1-га месца. Другое месца ў конкурсе заваявала Агарэвіцкае аддзяленне паштовай сувязі (начальнік – Наталля Васільеўна Дулік, паштальёны – Алена Іванаўна Коўш і Ганна Яраславаўна Валодзька), дзе падпісалася на 19 чалавек больш, чым падчас папярэдняй падпісной кампаніі. На 13 падпісчыкаў больш з’явілася і ў вёсцы Ганцавічы, дзякуючы старанней працы паштавікоў (начальнік п/а на час падпіскі – Іна Аляксандраўна Шапялевіч (цяпер працуе ў гарадскім п/а), паштальён – Зоя Сямёнаўна Мелехавец), якія занялі 3-е прызавое месца.

Калектывы паштовых аддзяленняў – пераможцы конкурсу – былі ўзнагароджаны Граматамі “ГЧ” і атрымалі грашовыя прэміі ў суме 500, 400 і 300 тысяч рублёў адпаведна занятым месцам.

З усіх 19-ці паштовых аддзяленняў раёна 15 паспяхова правялі падпісную кампанію і павялічылі колькасць падпісчыкаў “ГЧ”. Кожны з паштальёнаў гэтых аддзяленняў атрымаў асобную прэмію адпаведна павялічанай колькасці падпісчыкаў.

Выказваем шчырую падзяку работнікам паштовых аддзяленняў за іх плённую працу па падпісцы чытачоў.

■ РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ “ГАНЦАВІЦКІ ЧАС”

Во сколько обойдется родителям подготовка ребёнка к школе?

НАШ КОШЕЛЕК

Корреспондент «ГЧ» узнала, какую сумму денег придется потратить, чтобы закупить для ребёнка самое необходимое к 1 сентября, а также выяснила, на чём можно сэкономить.

Сначала я отправилась на рынок. Как выяснилось, там нет ни одного торгового места, где можно одеть ребенка от «А» до «Я». В одном роллете можно приобрести костюм для мальчика, в другом есть товары для девочек, в третьем школьная одежда есть, но не всех востребованных размеров… В общем, если побегать по всему рынку и близлежащим частным магазинам, то одеть ребенка можно. Однако какого качества будет эта одежда и сколько времени будет потрачено на её приобретение? Все товары на рынке импортного производства, состав их не очень хорош (слишком много синтетики), хоть и выглядят вещи довольно-таки привлекательно (не считая неаккуратных швов на некоторых из них).

Следующей торговой точкой стал магазин РайПО «Детский мир». Здесь большой выбор костюмов делового стиля для мальчиков. На вешалках аккуратно висят сарафаны разных фасонов для школьниц, а также множество костюмов-«двоек» и -«троек» по разным ценам. Имеется большой ассортимент рубашек для мальчиков и блузок для девочек из 100%-го хлопка. Ценовой диапазон также различен. Радует богатый выбор обуви для первоклассников. Хоть она и дороже в два раза, чем на рынке, зато качественная. В магазине есть обувь как из кожзаменителя, так и из натуральной кожи. Цены на товар из кожзаменителя не выше рыночных, а из натуральной – дороже. В магазине можно выбрать спортивный костюм хорошего качества и дешевле рыночной цены. Спортивная футболка стоит на 10 тысяч дешевле, чем на рынке, гольф для девочки либо мальчика – на 20 тысяч дешевле. За два бантика для девочки по рыночной цене нужно отдать около 50 тысяч, а в магазине они стоят в два раза дешевле. Цены многих вещей в магазине совпадают с рыночными. Но не стоит забывать о том, что за одни и те же деньги можно купить более качественный товар именно в магазине.

Из таблицы цен на одежду следует, что одеть ребенка на рынке можно чуть дешевле. Однако нужно помнить о том, что скупой платит дважды. Покупая обувь на рынке, нужно быть готовыми к тому, что придется покупать вторые туфли на один сезон.

Если учесть ещё и время, которое будет потрачено на поиски нужного товара, то, конечно, проще пойти в магазин, в котором можно купить все необходимое, а не бегать по всему городу в поисках нужного товара.

Если внимательно изучить цены на товары по приведенным таблицам и купить вещи и канцелярские товары там, где они стоят дешевле, не считаясь со временем и качеством, то можно сэкономить 200 тысяч рублей и больше (все зависит от того, сколько вещей будем покупать).

Примечание автора. В таблицах указаны самые низкие цены, по которым можно приобрести товар. В магазине РайПО товар белорусского производства, в таблице указаны цены за кожаную обувь. Стоимость товара указана по состоянию на 8 августа. Из приведенной таблицы цен на канцтовары можно сделать вывод: купив письменные принадлежности в городе Барановичи, можно хорошо сэкономить.

■ ЮЛИЯ ПОЛЕССКАЯ



Цена ученической экипировки на 1 сентября будет стоить приблизительно 800 тысяч, рюкзак со всем необходимым – около 600 тысяч. Таким образом, на одного первоклассника родители потратят примерно 1 миллион 400 тысяч рублей. ФОТО АВТОРА



Ученица СШ №1 г. Ганцевичи Ульяна Наумик выбирает для себя школьную одежду. ФОТО АВТОРА.

Таблица цен на канцтовары

Наименование	Ценаыв магазине РайПО	Цены на рынке г. Ганцевичи	Цены в городе Барановичи
Тетрадь (круп. кл., уз.лин.)	950х10= 9 500	1000х10= 10000	850х10= **8 500**
Обложка для тетрадей	600х10= 6 000	400х10= 4 000	200х10= **2 000**
Папка для тетрадей	20.000	**17 000**	18800
Альбом для рисования	6450	13 000	**6200**
Линейка	1950	3000	**1600**
Трафареты геомет фигур, шрифтов	2400+ 7 200= **9600**	9500+16 000 = 25 500	4600+13 700= 18300
Фломастеры (12шт.)	10 600	18 000	**7300**
Акварель	9350	13 000	**8200**
Стакан-непроливайка	5700	5000	**4800**
Палитра	7000	5500	**4250**
Набор кистей	21 000	14000	**12 300**
Гуашь	24 500	25 000	**19 700**
Цветные карандаши	22 900	26 000	**10 100**
Цветные мелки	5600	4400	**4300**
Точилка	2100	3300	**1800**
Ластик	1350	2000	**1000**
Карандаш простой	2350	3000	**1200**
Ручки	2000	3000	**1200**
Пенал	16 000	**13 000**	15 000
Клей ПВА	**3500**	7000	5000
Ножницы	14 000	15 000	**7600**
Цветная бумага	**5000**	8500	6800
Набор картона	12 000	11 200	**7200**
Касса	15 000	15 000	**9450**
Счетные палочки	**2500**	6500	4200
Веер цифр+букв	6000	**4500**	11 000
Папка на 20 файлов	16550	16550	**11 600**
Хрестоматия от 6до 10 лет	63 000	63 000	**50 000**
Книжка-раскраска	**3500**	5000	3500
Мозаика	48 000	65 000	**28 000**
Лото	37 000	46 000	**27 000**
Доска для лепки	**4550**	7200	5700
Пластилин	12 100	13 400	**12 000**
Всего	426 650	491 550	**335 600**

Таблица цен на школьную одежду

Наименование товара	Цена в магазине РайПО		Цена на рынке	
	Девочка	Мальчик	Девочка	Мальчик
Деловой костюм	350 000	400 000	**345 000**	**385 000**
Сарафан	150 000	-	**145 000**	-
Спортивный костюм	**180 000**	**180 000**	195 000	230 000
Спортивная обувь	110 000	110 000	**90 000**	**75 000**
Туфли	250 000	250 000	**125 000**	**125 000**
Блузка/ рубашка	150 000	**110 000**	120 000	**90 000**
Рюкзак	**170 000**	**170 000**	180 000	180 000
Нательное белье	26 000	26 000	**16 000**	**16 000**
Галстук (бабочка)	-	23 000	**-**	**18 000**
Белые бантики	**15000**	-	27 000	-
Колготы/ Носки	12 000	**8 000**	14 000	**7 000**
Всего	**1 413 000**	**1 277 000**	**1 257 000**	**1 126 000**

Сціплая ў жыцці, душэўная ў вершах

ЮБІЛЕЙ

11 жніўня паэтка Ніна Рыгораўна Таўтын, вершы якой ведаюць у раёне, адзначала свой 65-ы дзень нараджэння. З гэтай нагоды ў Хатыніцкім СДК адбылася вечарына, якая сабрала шмат аднавяскоўцаў, гасцей і былых калег юбіляркі.

Рыхтавалі мерапрыемства і былі вядучымі бібліятэчныя работнікі Галіна Вайцяховіч і Галіна Свірыд. У праграме былі віншаванні падарункамі, вершамі, якія чыталі госці, і 9-класніцы Анастасія Віннік і Наталля Канановіч з узорнага аб'яднання "Верасок", а таксама песнямі. Сардэчна віншавалі юбілярку дачка Надзея Рабцэвіч (яна, дарэчы, пайшла па слядах маці і працуе паштальёнам) і малодшая сястра Таццяна Васільеўна з пляменніцай Антанінай. Усе яны вельмі хораша спяваюць, таму павіншавалі імянінніцу задушэўнымі песнямі.



Я люблю сваю родную вёску

Я люблю сваю родную вёску,
Дзе цудоўныя людзі жывуць.
Я люблю на ўскрайку бярозку,
Дзе салоўкі штоночы пяюць.

Я люблю, як спяваюць дзяўчаты,
А іх песня над вёскай гучыць.
І чаромхавы пах каля хаты
Можа сэрца маё ажывіць.

Я люблю, як у квецені белай
Зацвітаюць вясною сады,
А пад восень антонаўкі спелай
Да зямлі абвісаюць плады.

Я люблю, калі спее рабіна
І агнём яе гронкі гараць.
Зноў тады я знаходжу хвіліны,
Каб пад ёю ў цішы пастаяць.

Зноў надыхацца родным паветрам
І адчуць у душы цеплыню.
Зачарована ціха па ветры
Жоўты ліст пworld прыляцеў на зямлю.

Фальклорны гурт "Хатовічы", а таксама іншыя самадзейныя артысты СДК таксама парадавалі юбілярку і гасцей песнямі і плясамі. А Вольга Ваўчок павіншавала яшчэ і сваімі прыпеўкамі.

Не забыліся пра дзень нараджэння паэткі і работнікі цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы раёна. Ад імя ўсіх выступіла Надзея Наумік.

Віноўніцу ўрачыстасці павіншавалі таксама супрацоўнікі Хатыніцкага паштовага аддзялення Ірына Мінько, якая шмат гадоў працавала з Нінай Таўтын, і Антаніна Канановіч.

Аднавяскоўцы добра ведаюць паэтку і паважаюць яе. Вельмі пранікнёна ад імя ўсіх аднасяльчан юбілярку павіншаваў староста вёскі Андрэй Ярашэвіч. Суседкі Марыя Казак, Тамара Галоўчык і Марыя Наумік выказаліся, што Ніна Рыгораўна – вельмі дабрай душы чалавек. Ужо шмат гадоў яны ведаюць адзін аднаго, і не прыпомняць, каб калі-небудзь іх суседка адказала ім у нечым. Усе жыццёвыя праблемы яна заўсёды вырашала мірна і іншым раіла так рабіць.

Папрысутнічалі на свяце былы начальнік Ганцавіцкага раённага вузла паштовай сувязі Вера Рублеўская і цяперашні начальнік РВПС Эдуард Валуевіч. Ён павіншаваў імяніннiцу і паабяцаў грашовае ўзнагароджанне.

Калектыў газеты "Ганцавіцкі час" таксама шчыра віншуе Ніну Рыгораўну з юбілейным Днём нараджэння і жадае ёй моцнага здароўя, доўгіх гадоў жыцця, добразычлівых людзей побач, творчага натхнення і новых вершаў.

■ ЮЛІЯ ПАЛЕСКАЯ

Многае зроблена, але ёсць яшчэ над чым папрацаваць…

ПО СЛЯДАХ ПУБЛІКАЦЫ

Некаторыя праблемы, якія былі агучаны ў газеце "ГЧ", ужо вырашаны. Але "слабыя месцы" ўсё яшчэ ёсць, і хочацца верыць, што яны таксама хутка знікнуць.

НЕКАТОРЫЯ ПРАБЛЕМЫ ВЫРАШЫЛІСЯ…

У 24-м нумары газеты "ГЧ" за 4 ліпеня была апублікавана заметка "Ці з'явіцца пясочніца на Паркавай?", у якой падымалася праблема адсутнасці пясочніцы для дзяцей. На "гарачую лінію" тэлефанавала Надзея Савеня, якая расказала, што ўжо другі год запар звяртаецца ў наш камунгас з просьбай зрабіць пясочніцу, але ніякай рэакцыі няма. Журналіст звязалася з майстрам КУШВП ЖКГ Аляксандрам Курловічам, і ён паабяцаў, што пясочніца хутка з'явіцца. Так і адбылося: па словах Надзеі Якаўлеўны, пясочніцу зрабілі на другі дзень пасля выхаду газеты. Цяпер дзеткі з радасцю будуюць пясочныя замкі і "выпякаюць" піражкі.

У тым жа нумары быў надрукаваны артыкул "Малое скрыжаванне з вялікімі праблемамі", дзе агучваліся скаргі жыхароў вуліц Гойшыка, Калініна і Някрасава. Яны прасілі добраўпарадкаваць скрыжаванне іх вуліц, у тым ліку закрыць накрыўкай люк, які амаль тры гады стварае небяспеку. Толькі пасля таго, як пытанне было агучана на ўвесь раён, камунальнікі заварушыліся: заказалі накрыўку для люка ў Мінску, а калі яна была гатова, закрылі дзірку.

…АЛЕ ЗАСТАЛІСЯ ІНШЫЯ

На некаторых дарогах па-ранейшаму можна наткнуцца на адкрытыя люкі. Як падказалі нам гараджане, адразу два такія люкі ёсць на вуліцы Арлоўскага. Яшчэ адзін – па вуліцы Мантажнікаў: люк знаходзіцца пасярод дарогі і накрыты ён драўлянай накрыўкай. Гэтую "мясцовую славутасць" вадзіцелі аб'язджаюць з двух бакоў.

Дарэчы, у горадзе ёсць і іншыя самаробныя люкі, адказнасць за якія нясуць камунальнікі або сувязісты. Некаторыя з іх відаць здалёк, а ёсць і тыя, якія прыкмеціць цяжка. Добра, калі вадзіцелі ведаюць аб усіх сюрпрызах дарогі і зараней збаўляюць хуткасць. А калі не?.. Абыякавасць адказных служб і нежаданне звяртаць увагу на такія "малыя" праблемы могуць прывесці да вялікай трагедыі…

"Вось добра, што вы сфатаграфуеце гэтую безгаспадарчасць. Можа, мясцовыя ўлады пабачаць ды зробяць што. Няўжо ім усё роўна, што робіцца там, дзе яны не ходзяць? Не толькі чужое дзіця ці ўнук можа трапіць у бяду з-за гэтых праклятых люкаў, але ж і іхнія, дык навошта адмахвацца ад праблемы?!", – выказалася пажылая жанчына, адганяючы сваю козачку Мілку ад зараслага пустазеллем люка па вуліцы Мантажнікаў, які знаходзіцца пад "апекай" сувязістаў.

Начальнік лінейна-дыстанцыйнага цэха Міхаіл Гарадзецкі падзякаваў за "сігнал" і паабяцаў адкрыты люк закрыць у той самы дзень, калі карэспандэнт "ГЧ" патэлефанавала яму. Так і адбылося: пад вечар люк быў закрыты.

■ ЮЛІЯ ПАЛЕСКАЯ



Вельмі радуе тое, што камунгас адрэагаваў на зварот і цяпер дзеткі маюць магчымасць гуляць у пясочніцы. ФОТА АЎТАРА



Люк, які знаходзіцца пасярод дарогі па вуліцы Мантажнікаў. ФОТА АЎТАРА



До завоевания золотых медалей в чемпионате района « Строитель – ПМК-14» остаётся сделать полшага.
ФОТО ПЕТРА ГУЗАЕВСКОГО

Кричат болельщики: “Гол!..”

ФУТБОЛ

Прошедшая неделя для спортивных болельщиков стала настоящим праздником различного как по качеству, так и по содержанию футбола. Всего четыре дня, со среды по воскресенье, вместили в себя три встречи стартовавшего Кубка района, товарищеский матч между футбольными клубами «Ганцевичи» и «Волна» (Пинск), а также развязку одной из интриг чемпионата района по футболу. Итак, обо всём по порядку.

КУБОК РАЙОНА

В среду, 7 августа, после долгого перерыва матчем 1/4-ой финала между командами «ДЮСШ – СПК «Огаревичи» и «ПМК-14 – Строитель» стартовал розыгрыш Кубка района по футболу. К чести учащихся спортивной школы, в первом тайме они на равных противостояли сильному противнику. Не позволяя создавать опасные ситуации возле своих ворот, «школята» не забывали и об организации угроз у чужих. Вот только достойно проведя первую половину игры, игроки Огаревичской ДЮСШ полностью провалились во второй: на поле доминировали «строители». Итог встречи 7:1 в пользу «Строителя – ПМК-14» более чем справедлив. Причем три гола в составе команды победителей забил Иван Водопьян.

В противостоянии «Озеречья» и СПК «Хотыничи» более сильными оказались представители Клецкого района. Хотя стоит отметить, что игровым преимуществом практически на протяжении всего матча владели хотынические футболисты. Они же в конце первого тайма и открыли счёт (отличился Артем Козак). Во втором тайме сработало старое футбольное правило: *«Не забиваешь ты – забивают тебе»*. Уже когда основное время матча подходило к завершению, игроки «Озеречья» буквально в течение 3 минут сумели провести две голевые атаки. Но на девяностой минуте, фактически на «падающем флажке», «Хотыничи» сравняли счёт 2:2 и перевели игру в дополнительное время. И тут сказалась более длинная скамейка запасных команды воинской части: выпуская на замену свежих игроков, они сумели «додавить» гостей. Итоговый результат матча – 4:2 в пользу «Озеречья», и теперь эта команда прошла в полуфинальную стадию кубка.

В воскресном матче между «Динамо-2013» и «РайПО» борьбы как таковой не получилось. Уж слишком разнился класс соперников. Финальный свисток главного арбитра встречи Дмитрия Матулиса зафиксировал счёт 12:0 в пользу представителей «торговли»: только один из игроков «РайПО», Дмитрий Крицкалюк, забил в ворота «Динамо-2013» 6 мячей.

Четвёртый поединок 1/4-ой стадии кубка района между «Будчей» и «Мальковичами», в котором определится четвёртый полуфиналист, состоится позднее.

ТОВАРИЩЕСКИЙ МАТЧ ФК «ГАНЦЕВИЧИ»

